

РЭЗЕРВЫ ДЛЯ ІНТЭГРАЦЫІ

МС

МОЛАДЗЬ БЕЛАРУСІ І РАСІІ ПРА ПЕРСПЕКТЫВУ СУПРАЦОЎНІЦТВА

МС





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 КАСТРЫЧНІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 202 (28818)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КУХАРАЎ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Пытанні, з якімі сёння сутыкаюцца кіраўнікі прадпрыемстваў будаўнічай галіны, патрабуюць кардынальных рашучых мер. Калі іх не прымаць цяпер, то ў найбліжэйшай будучыні мы сутыкнёмся з сур'ёзнымі праблемамі. У прыватнасці, неабходна праводзіць раннюю і на глыбокім узроўні прафарыентацыйную работу сярод школьнікаў. Выкарыстоўваць для гэтага ў тым ліку сучасныя тэхналогіі. Асаблівую ўвагу варта ўдзяляць навучальным праграмам устаноў адукацыі, дзе рыхтуюць будучых спецыялістаў. Яны патрабуюць сур'ёзнага перагляду, насычэння актуальнай інфармацыяй, падрыхтаванай пры падтрымцы работнікаў вытворчасці, каб на выпуску малады спецыяліст выходзіў сапраўды гатовым да працы. Мы не можам траціць велізарныя бюджэтныя грошы і вучыць таму, што ў жыцці не спатрэбіцца. Гэтаму пытанню павінна быць удзелена самая сур'ёзная ўвага».*

# ДРУЦКІ ПАШТАЛЬЁН



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Друцкім аддзяленні сувязі Талачынскага раёна толькі адзін супрацоўнік — Алена ДУНАЕВА *(на фота)*. Яна сумяшчае абавязкі і начальніка ўстановы, і паштальёна. Наогул, Алена працуе ў сферы сувязі болей за пятнаццаць гадоў. Штодня яна з паштарскай сумкай на плячы шпацыруе па родным старажытным Друцку, разносячы карэспандэнцыю і перыёдыку.**

## КОРАТКА

- **Расія дадаткова пералічыць Беларусі 27 млрд расійскіх рублёў (больш за $400 млн) у якасці экспартных пошлін з-за росту цэн на нафту.**
- Васямнаццаць беларускіх мультфільмаў увайшлі ў конкурсную праграму XXI Міжнароднага фестывалю анімацыйных фільмаў «Анімаёўка-2018», які пройдзе 26—28 кастрычніка ў Магілёве.
- **У Баранавіцкім раёне на трасе М1 перакулілася фура з яблыкамі.**



Сезонны рынак

# «І ПАГАВАРЫЎ, І КАПЕЙЧЫНУ ЗАРАБІЎ»

## Наколькі запатрабаваны бясплатныя гандлёвыя месцы для пажылых

**Ужо некалькі гадоў у Мінску на рынках выдзяляюцца бясплатныя гандлёвыя месцы для пенсіянераў і інвалідаў. Тут можна рэалізаваць лішкі ўраджаю. Сёлета такую магчымасць даюць 16 сталічных рынкаў. А ці ёсць попыт з боку саміх пажылых людзей? Якую садавіну і агародніну вязуць пенсіянеры на продаж, што рабіць з кабачкамі, калі за дзень іх не паспелі разабраць, і ці хапае месцаў за прылаўкамі ўсім ахвотным, мы даведаліся на Камароўцы.**

Сёння на бясплатных месцах на сезонным рынку гандлюе 40 прадаўцоў. Яблыкі ёсць ледзь не ў кожнага. Але, кажуць, з-за таго, што ў гэтым годзе ўраджай вялікі, іх слаба бяруць.

— Кабачкі вельмі танна аддаём — па рубель пяцьдзясят за кілаграм, — дзеліцца пенсіянерка Ганна Пятроўна. Яе ўчастак знаходзіцца ў вёсцы Залессе Дзяржынскага раёна.

— Сама ўсё вырошчваю — бачыце, рукі якія, — паказвае бабуля спрацаваныя далоні. На прылаўку перад ёй ляжаць грушы, стаяць кабачкі з малінай. — А бачыце, якая цыбуля-прыгажуня? Шалот называецца. Вельмі смачная, салодкая, хутка гатуецца. Пад адным карчом расце да дзевяці штук — самі наверх вылазяць.

Гандлюе Ганна Пятроўна даўно. Як выйшла на пенсію, так і стала ездзіць са сваім таварам на рынак. А дагэтуль працавала на Мінскім прыборабудаўнічым заводзе імя Леніна (цяперашні «Амкадор-Белвар») — на вытворчасці друкаваных плат.

У прадаўцоў жанчына пайшла, каб дапамагаць дзецям і ўнукам. «Гэта стымул жыцця. А што нам, старым, трэба?»



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Аляксандра Захараўна ЛАЗУКА любіць стаяць на рынку.**

Яе суседка па прылаўку Аляксандра Захараўна Лазука бядуе: вырасціць лягчэй, чым прадаць. Вось у яе гарбузоў сёлета — цэлыя вагоны. Прадае па 50 капеек за кіло. А дагэтуль 80 штук здала скупшчыкам усяго па пяць капеек за кілаграм. «Не бралі даражэй», — тлумачыць.

У Аляксандры Захараўны 25 сотак у Слуцкім раёне. За лета нарасціла там часнаку, бульбы, фасолі, насушыла мех семак.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

18202>

# СПРАВЯДЛІВАСЦЬ ЯК НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ

**Ідэолагі павінны разумець праблемы людзей — такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе з кіраўніцтвам Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, на якой абмеркавалі ключавыя напрамкі работы ведамства.**



Фота БелТА.

## Размежаванне паўнамоцтваў

У пачатку рабочай сустрэчы беларускі лідар нагадаў, што, як бакі і дамаўляліся раней, сустрэчы з палітычным, эканамічным і сілавым блокамі краіны будуць праходзіць рэгулярна.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў бягучым годзе ўжо двойчы прайшлі пасяджэнні Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь.

«Пастаўлены задачы абноўленаму ўраду краіны, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Сёння мы ў крыху абноўленым і пашыраным складзе Адміністрацыі Прэзідэнта абмяркуем надзённыя пытанні, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі Адміністрацыі».

Беларускі лідар адзначыў, што задача Адміністрацыі — быць маналітным экспертным цэнтрам, дзе выпрацоўваюцца ўзважаныя рашэнні па многіх пытаннях. Паводле яго слоў, не варта замахвацца на выпрацоўку рашэнняў па ўсіх пытаннях нават зыходзячы з колькаснага складу. «Вы павінны займацца сваёй справай, — адзначыў Прэзідэнт. — Я раблю на гэтым акцэнт, таму што з ранейшым складам урада, ды і з цяперашнім у вас ужо пачынаюцца нейкія, як у народзе кажуць, «цёркі», блытаніна. Вось гэтага быць не павінна».

У сваю чаргу найважнейшыя эканамічныя моманты будуць разглядацца ва ўрадзе і адпаведныя рашэнні будуць выпрацоўвацца там жа.

Такім чынам, Адміністрацыя выступае ў якасці фільтра па мностве пытанняў. Яна не можа змяніць рашэнні ўрада, але павінна звярнуць увагу беларускага лідара на тыя аспекты, якія разыходзяцца з патрабаваннямі і ўказаннямі Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што тое ж самае датычыцца і сілавога блока краіны: для гэтага існуе Дзяржаўны сакратарыят Савета бяспекі. Паводле яго слоў, хай ён і невялікі па складзе, але яго спецыялісты лепш разбіраюцца і разумеюць, якім чынам рэалізоўваць указанні і даручэнні Прэзідэнта як галоўнакамандуючага.

«Размежаванне паўнамоцтваў — гэта важнае пытанне. Але тое, што ўсе пытанні павінны праходзіць праз Адміністрацыю Прэзідэнта — гэта факт. Нікому не забараняецца звярнуць маю ўвагу нават на ваенныя пытанні, калі вы бачыце, што з вашага пункту гледжання там нешта не так», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

## Служыць — людзям

«Адной з ключавых функцый Адміністрацыі застаецца пастаяннае ўдасканаленне кадравай палітыкі на ўсіх узроўнях. Гэта мае нязменнае патрабаванне, асабліва ў дачыненні да асоб, уключаных у кадравы рэестр Прэзідэнта. Вось гэта ўжо ваш хлеб. Гэта ваш хлеб, пытанні кадравыя, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Вы — тыя, хто павінен неадкладна рэагаваць на любыя змены сітуацыі ў палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і іншых сферах. Выпрацоўваць і акумуляваць самыя перадавыя ідэі, неабходныя для развіцця краіны. Людзей абыякавых тут быць не можа».

Прэзідэнт выказаў незадаволенасць узроўнем работы Адміністрацыі па кадрах: «Узровень вашай работы па кадрах мяне не натхняе, калі ўжо гаварыць шчыра. Працуеце вы пакуль слаба».

Звяртаючыся да прысутных, Прэзідэнт нагадаў, як імкліва, часам непрадказальна, мяняецца сітуацыя ў свеце, а ўслед за ёй і свядомасць людзей. На думку кіраўніка дзяржавы, першымі гэта павінны адчуваць людзі, якія працуюць у ідэалагічнай вертыкалі.

«Гэта адна з галоўных умоў стабільнасці ў грамадстве і аснова для далейшага развіцця. Ідэолагі павінны ўмець працаваць з насельніцтвам, разумець праблемы людзей, дакладна і дзейсна адказваць на ўсе магчымыя выклікі», — падкрэсліў ён.

Прэзідэнт таксама выказаў пажаданне, каб работа ў сферы ідэалогіі ажыццяўлялася больш сістэмна: «Не ў захапленні я і ў гэтым плане. Прынамсі, сістэмы ў гэтай справе пакуль няма».

Галоўнае патрабаванне ў рабоце палітычнага блока — сумленнае і справядлівае стаўленне да людзей. «Мы з вамі даўно ўдзяляем увагу менавіта гэтаму пытанню. І ў аснову нашай палітыкі — я заўсёды гэта вам казаў і патрабаваў ад вас — трэба пакласці, і ў нас заўсёды гэта было, пытанні справядлівасці», — сказаў ён.

Беларускі лідар адзначыў, што асаблівая роля ў рэалізацыі гэтых пытанняў адведзена памочнікам Прэзідэнта. Акцэнт у іх рабоце — грамадска-палітычная і сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў рэгіёнах, абстаноўка ў кожным канкрэтным калектыве.

Прэзідэнт пацікавіўся ў прысутных, як працуе мясцовая ўлада, якія праблемы хвалююць жыхароў рэгіёнаў. «Вы павінны валодаць сітуацыяй і своечасова рэагаваць на тое, што адбываецца, больш таго, ажыццяўляючы кадравую палітыку — а вы яшчэ і інспектары па кадрах у кожным рэгіёне, — кадры трэба ацэньваць менавіта з гэтых пазіцый, як развіваецца сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў тым ці іншым рэгіёне, якая тут роля кадраў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што хацеў бы пачуць ацэнку стану спраў на месцах.

## Працаваць — камандай

«У сферы эканомікі, як і раней, ваша задача — глыбокі аналіз усіх прапанаваных рашэнняў, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Ацэнка іх адпаведнасці дзяржаўнай сацыяльнай палітыцы. Тое, пра што я кажу. Аналіз іх уплыву перш за ўсё на чалавека, на развіццё галін, рэгіёнаў і краіны ў цэлым».

Акрамя таго, адным з найважнейшых напрамкаў дзейнасці Адміністрацыі з'яўляецца экспертна-прававая работа і каардынацыя дзейнасці дзяржаўных органаў у сферы права. Беларускі лідар адзначыў, што тут сёння добра зарэкамендавала практыка прыцягнення грамадскасці і экспертных саветаў да абмеркавання праектаў прававых актаў, паколькі калі нешта не ўбачаць распрацоўшчыкі, то слабыя месцы ў дакуменце ім заўсёды падкажа народ.

У якасці прыкладу Прэзідэнт прывёў канцэпцыю закона «Аб супрацьдзеянні хатняму гвалту», якая не толькі падверглася крытыцы з яго боку, але і выклікала абурэнне ў шырокіх колах насельніцтва. «Варта і надалей выносіць найбольш значныя дакументы на суд грамадскасці», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Але не так, як нядаўна мне дакладваюць: Канстытуцыйнаму суду няма чым больш заняцца — яны пачалі абараняць адвакатаў. Бяру дакументы, гляджу, як праходзіла пасяджэнне Канстытуцыйнага суда. Аказваецца, аж цэлы намеснік ваш (намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — **«Зв.»**) там быў . І тым не менш працэс запушчаны. Ужо за двое сутак літаральна ўнеслі праект закона на ўзроўні Мінюста. У мяне адразу пытанне: вам, што, больш няма чым займацца разам з Канстытуцыйным судом? — выказаў меркаванне беларускі лідар. — Чым адрозніваюцца, дапусцім, адвакаты, якіх вы там пачалі асобна выводзіць як касту і абараняць, рабіць іх у нейкай частцы недатыкальнымі? Чым яны адрозніваюцца ад вас, ад іншых дзяржаўных служачых? Чым яны адрозніваюцца ад суддзяў, прадстаўнікоў пракуратуры, следчых органаў? Вы хочаце запусціць гэты махавік? Каб потым прыйшлі пракуроры і сказалі: нам таксама патрэбныя нейкія ўмовы, калі мы дзесьці пракалоліся або праколемся. Усе ў краіне перад законам роўныя!»

На думку Аляксандра Лукашэнкі, вельмі важна забяспечваць аднастайнае прымяненне заканадаўчых актаў. «І галоўнае, каб мы дакладна разумелі, што ўсе блокі ўлады ў краіне павінны працаваць зладжана, павінна быць поўнае ўзаемадзеянне», — дадаў беларускі лідар.

Ад кіраўніцтва Адміністрацыі ён чакае эфектыўнай каманднай работы і беспярэчнага выканання сваіх даручэнняў.

***

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава адзначыла, што ў мэтах выканання даручэнняў лідара краіны самая пільная ўвага ўдзяляецца пытанням удасканалення кадравай і ідэалагічнай палітыкі, дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату.

З улікам гэтага ў рэгіёнах праведзены сустрэчы з усімі старшынямі рай- і гарвыканкамаў. Ім дадзены асноўныя патрабаванні ў рабоце, пастаўлены задачы, якія неабходна вырашаць мясцовым органам улады. Найбольш актуальнай задачай для Адміністрацыі застаецца павышэнне прафесійнага ўзроўню і эфектыўнасці работы самой Адміністрацыі.

«Умацаванне кадравага патэнцыялу найбольш падрыхтаванымі і адказнымі спецыялістамі, якія разумеюць значнасць ускладзеных на іх задач. За апошні час праведзена замена начальнікаў галоўных упраўленняў (ідэалагічнага, арганізацыйнага). Актыўна абнаўляецца кіруючы склад на ключавых дзяржаўных пазіцыях. Так, за апошні год праведзена ратацыя 140 службовых асоб, якія знаходзяцца ў кадравым рэестры кіраўніка дзяржавы», — сказала Наталля Качанава.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ЭКСПАРТ РАСЦЕ

**Пра гэта журналістам расказаў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ па выніках рабочай сустрэчы з кіраўніком дзяржавы.**

Паводле яго слоў, Аляксандр Лукашэнка быў азнаёмлены з вынікамі работы Міністэрства замежных спраў у сферы знешнеэканамічнай дзейнасці. «Гэта наша галоўная задача, якой Прэзідэнт заўсёды ўдзяляе вялікую ўвагу. У цэлым было адзначана, што тэндэнцыя па росце экспарту захоўваецца. Па выніках года мы выйдзем, вядома ж, на станоўчы рэзультат. Праўда, ідзе некаторае запаволенне тэмпаў росту экспарту, але ў цэлым мы чакаем пазітыўных вынікаў года, звязаных са знешнеэканамічнай дзейнасцю», — адзначыў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства краіны.

Уладзімір Макей таксама расказаў, што асаблівую ўвагу Прэзідэнт звярнуў на тое, каб «напружваліся ўсе» — і рэгіёны, і адпаведныя галіновыя міністэрствы, і, вядома ж, кіраўнікі замежных устаноў. Па завяршэнні года будзе дадзена ацэнка кожнаму персанальна ў тым, што датычыцца выканання задач па экспарце беларускіх тавараў за мяжу.

Акрамя таго, Уладзімір Макей праінфармаваў Аляксандра Лукашэнку аб выніках удзелу кіраўніка МЗС у сустрэчы міністраў замежных спраў краін Еўрасаюза і Усходняга партнёрства, якая нядаўна прайшла ў Люксембургу. У прыватнасці, было даложана аб рабоце над тымі дакументамі, якія цяпер адпрацоўваюцца з Еўрапейскім саюзам, — гэта прыярытэты партнёрства, пагадненне аб аблягчэнні візавага рэжыму, аб рэадмісіі.

«У цэлым ёсць зрухі, прычым істотныя, па ўсіх дакументах. На жаль, не па нашай віне перыядычна з'яўляюцца новыя нюансы, якія патрабуюць дадатковага часу для аналізу, удакладненняў і прыняцця рашэнняў. Таму мы будзем спакойна працаваць над гэтымі дакументамі, зыходзячы з таго, што нашы нацыянальныя інтарэсы павінны быць выкананы. Але паўтаруся: зрухі ёсць, — падкрэсліў ён. — І ёсць дакладная ўстаноўка кіраўніка дзяржавы адносна працягу курсу на развіццё нармальных, у першую чаргу гандлёва-эканамічных, палітычных і гуманітарных, адносін з Еўрапейскім саюзам, які з'яўляецца нашым другім па важнасці гандлёва-эканамічным партнёрам».

Уладзімір Макей далажыў Прэзідэнту аб будучым графіку знешнепалітычных сустрэч, візітаў замежных прадстаўнікоў у Беларусь, а таксама візітаў кіраўніка дзяржавы за мяжу. Так, канец года ў гэтым плане ў Аляксандра Лукашэнкі абяцае быць насычаным.

Беларускаму лідару было дэталёва даложана аб падрыхтоўцы найбліжэйшага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны, які пройдзе 25—26 кастрычніка ў Гомелі. У рамках мерапрыемства плануецца падпісанне шэрагу пагадненняў, кантрактаў на некалькі дзясяткаў мільёнаў долараў. Па словах міністра замежных спраў, нявырашаных пытанняў у гэтым кірунку ў прынцыпе няма. У сваю чаргу беларускі лідар даручыў, каб гэтая падзея была арганізавана на найвышэйшым узроўні.

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства ў сваім дакладзе праінфармаваў Прэзідэнта аб падрыхтоўцы да яшчэ аднаго важнага мерапрыемства — сустрэчы асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы, якая адбудзецца 31 кастрычніка і 1 лістапада ў Мінску. Уладзімір Макей адзначыў, што свой удзел пацвердзілі шэраг высокапастаўленых асоб, сярод іх — прэзідэнты, прэм'ер-міністры, міністры замежных спраў, прадстаўнікі спецслужбаў, кіраўнікі аналітычных супольнасцяў. Паводле яго слоў, парадак дня вельмі актуальны: як пазбегнуць далейшага нагнятання канфрантацыі, якая сёння існуе ў рэгіёне. Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым таксама даў адпаведныя даручэнні.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## Парламенцкі дзённік

# ДОСВЕД СЯБРА — ДОБРЫ ДОСВЕД

**Дзеля абмену вопытам дзейнасці ў сацыяльнай сферы парламентарыі з Кітая прыехалі ў Беларусь. Учора яны сустрэліся са сваімі беларускімі калегамі ў Палаце прадстаўнікоў.**

**Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу,** адзначыў: «Мы, безумоўна, пільна сочым за сітуацыяй, якая адбываецца ў Кітаі. Нас вельмі радуюць і здзіўляюць перш за ўсё тэмпы росту эканомікі вашай краіны». Дэпутат расказаў, што азнаёмлены з той амбіцыйнай задачай, якая стаіць перад кітайскім народам у найбліжэйшай перспектыве. Пры гэтым ён заўважыў, што відаць, як растуць не толькі «лічбы» (тавараабарот і іншае), але і ўзровень дабрабыту людзей, і дадаў, што прыкладна такія ж задачы стаяць і перад нашай краінай. Узаемнае вывучэнне вопыту дапаможа прасоўваць агульныя інтарэсы.

Кітайскую дэлегацыю падчас візіту чакае насычаная праграма, беларускі бок таксама цікавяць кітайскія напрацоўкі ў сацыяльным сектары. **ЖЭНЬ Сяньлян, намеснік старшыні Камітэта па сацыяльным будаўніцтве Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Кітая**, расказаў, што камітэт займаецца пытаннямі працаўладкавання і сацыяльнага забеспячэння насельніцтва, а таксама абаронай правоў і інтарэсаў спецыяльных груп. Жэнь Сяньлян акцэнтаваў, што ёсць моманты, у якіх кітайскаму боку было б цікава павучыцца ў беларускага, — гэта экалогія і сацыяльнае будаўніцтва.

Дарэчы, Кітай самы вялікі эканамічны партнёр Беларусі ў Азіі. За студзень — жнівень гэтага года тавараабарот паміж краінамі склаў амаль 2,3 мільярда долараў. Гэта 122 % да адпаведнага перыяду 2017-га, прычым амаль сінхронна падраслі і экспарт, і імпарт.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# НАЗІРАЕЦЦА НОВАЯ ХВАЛЯ ЦІКАВАСЦІ ДА ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**Гэтымі днямі Выдавецкі дом «Звязда» сумесна з прэс-цэнтрам Дома прэсы правёў круглы стол на тэму «Вынікі і наступствы Першай сусветнай вайны для Беларусі».**

У ім прынялі ўдзел знаныя даследчыкі нашай краіны, навуковы інтарэс якіх скіраваны менавіта на дадзеную тэму. Гэта доктар гістарычных навук, прафесар Беларускага культурнага цэнтра духоўнага Адраджэння Анатоль Шаркоў, вучоны сакратар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Андрэй Салаўянаў, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Міхаіл Смалянінаў, загадчык аддзела навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Сяргей Трацяк, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Валянцін Мазец, гісторык, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне», аўтар праекта «У пошуках страчанага» Уладзімір Ліхадзедаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ Аляксандр Бурачонак, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ Андрэй Максімчык. Мадэратарам круглага стала выступіў дырэктар-галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел Сухарукаў.

Як адзначыў Андрэй Салаўянаў, у апошні час назіраецца вялікі рост цікавасці да тэмы Першай сусветнай вайны, таму невыпадкова прысутныя выбралі для абмеркавання менавіта яе.

— Вялікая колькасць супрацоўнікаў Інстытута гісторыі займаецца даследаваннем Першай сусветнай вайны, — адзначае Салаўянаў. — Да таго ж мы рады таму, што да нас прыходзяць маладыя супрацоўнікі, аспіранты, якія хочуць займацца менавіта Першай сусветнай. Яны знаходзяць штосьці новае і ў той жа час працягваюць традыцыі акадэмічнай школы. У апошні час гэта тэма набыла другое дыханне, бо ў савецкі перыяд яна даследавалася менш. Страты ў гэтай вайне былі не такія вялікія, як падчас Вялікай Айчыннай. Мы рады таму, што нашы суседзі, калегі з іншых краін таксама цікавяцца тэмай Першай сусветнай вайны. Яны прыязджаюць да нас, прапаноўваюць новыя праекты, якія мы сумесна імкнёмся рэалізаваць.

Падрабязную справаздачу з круглага стала чытайце ў наступных нумарах «Звязды».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

## Расказаць пра тое, што хвалюе

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 20 кастрычніка ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 на званкі будуць адказваць:**

✓ намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ВЯЛІЧКА.
Тэл. 8 016 221 31 21;

✓ кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ.
Тэл. 8 021 222 22 22;

✓ намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА.
Тэл. 8 023 233 12 37;

✓ кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ.
Тэл. 8 015 273 56 44;

✓ першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ЧЫКІДА.
Тэл. 8 022 250 18 69;

✓ намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ.
Тэл. 8-017 500 41 60;

✓ намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ.
Тэл. 8 017 222 44 44.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прызначана пасмяротная экспертыза юнаку, які ўчыніў у керчанскім каледжы выбух і стральбу



Гаворка ідзе не толькі аб псіхолага-псіхіятрычнай экспертызе, але і аб судова-медыцынскіх і балістычных.

Экспертыза прызначаецца для ўстанаўлення псіхалагічных асаблівасцяў чалавека, а таксама матываў дзеянняў, зробленых пры злачынстве. Пра гэта паведаміла афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Расіі Святлана Пятрэнка.

Нагадаем, што ў сераду днём 18-гадовы Уладзіслаў Раслякоў, студэнт керчанскага політэхнічнага каледжа, адкрыў стральбу і здзейсніў выбух у навучальнай установе. Ахвярамі трагедыі стаў 21 чалавек, больш як 50 былі шпіталізаваны, 10 з іх знаходзяцца ў цяжкім стане ў рэанімацыі. Крымінальная справа, распачатая па артыкуле «Тэракт», пазней была перакваліфікавана на артыкул «Забойства». У Крыме з чацвярга аб'яўлена трохдзённая жалоба.

## Лаўроў разлічвае, што ў НАТА «хопіць розуму» не дапусціць вялікай вайны



Кіраўнік МЗС Расіі Сяргей Лаўроў мяркуе, што ў НАТА «хопіць розуму» не дапусціць вялікай вайны, аднак без нармальнага дыялогу з Расіяй рызыкі ненаўмысных інцыдэнтаў значна ўзраслі.

Пра гэта ён сказаў у інтэрв'ю RT France, Paris Match і Le Figaro, адказваючы на пытанне аб тым, ці не ствараюць вучэнні НАТА ва Усходняй Еўропе пагрозу пачатку трэцяй сусветнай вайны.

Міністр нагадаў, што члены Савета Расія — НАТА сустракаліся за апошнія два гады тры разы, прычым без якога-небудзь выніку. Па словах міністра, прадстаўнікі Альянсу былі гатовыя абмяркоўваць толькі Украіну.

«Я стараюся заставацца ў рамках правіл прыстойнасці, але гэта азначае толькі адно: што Савет Расія — НАТА хацелі выкарыстаць як чарговы інструмент абвінавачванняў нас ва ўсіх смяротных грахах і як чарговы спосаб задаволіць капрызы нашых украінскіх суседзяў, якія спяць і бачаць, каб санкцыі вечна станавіліся больш жорсткімі, каб Расія была пастаянна пад агнём крытыкі», — дадаў ён. На думку Лаўрова, адмова НАТА ад дыялогу з Расіяй тлумачыцца ўплывам ЗША, якія ў рамках санкцыйных законаў забаранілі Пентагону кантакты з Расіяй.

## Парламент Малдовы не падтрымаў унясенне ў канстытуцыю пункта аб еўраінтэграцыі

Парламент Малдовы не падтрымаў папраўкі ў канстытуцыю, якія называюць еўрапейскую інтэграцыю стратэгічнай мэтай развіцця краіны. На пасяджэнні ў чацвер дакумент атрымаў толькі 54 з неабходных 67 галасоў у 101-месным парламенце.

Згодна з дакументам, у канстытуцыю прапаноўвалася ўнесці пункт аб тым, што «еўрапейская інтэграцыя Рэспублікі Малдова з'яўляецца стратэгічнай мэтай развіцця краіны». З такой ініцыятывай выступіў Уладзімір Плахатнюк, лідар Дэмакратычнай партыі Малдовы, якая кантралюе заканадаўчы орган. Ён растлумачыў, што папраўкі неабходныя, каб забяспечыць курс на еўраінтэграцыю незалежна ад палітычных змен, якія могуць адбыцца ў будучыні.

Супраць змен выступіў прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон, які заявіў, што не зацвердзіць папраўкі. Ён звярнуў увагу, што канстытуцыя забараняе абвяшчэнне адной ідэалогіі у якасці дзяржаўнай. На думку Дадона, палажэнні аб еўраінтэграцыі яшчэ больш абвостраць адносіны Кішынёва з непрызнаным Прыднястроўем і Гагаузскай аўтаноміяй, жыхары якіх імкнуцца да ўсходняга знешнепалітычнага вектара.


| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛАЯ РОМАШКА» | | | |
|---|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Лот № 1**<br>**Капитальное строение, инв. № 450/С-24046** (нежилое здание) общей площадью 415,5 кв. м, кирпичное, 2 этажа, 1926 г. п., **капитальное строение, инв. № 450/С-23995** (водопроводная сеть) общей протяженностью 79 м, **капитальное строение, инв. № 450/С-23996** (электрическая сеть) протяженностью 6 м, воздушная, кабель АС 4х16 | | |
| Местонахождение имущества: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Я. Купалы, д. 13** | | | |
| Информация о земельном участке | Площадь 0,0457 га, кадастровый номер 425450100001007441, назначение – для обслуживания зданий по ул. Я. Купалы,13. Ограничения (обременения) прав: земельный участок расположен в охранной зоне водных объектов вне прибрежных полос (0,0457 га), в охранной зоне линий электропередачи напряжением до 1000 вольт (0,0071 га) | | |
| Начальная цена | **52 380 белорусских рублей с учетом НДС** | Сумма задатка (3 %) | **1 571 белорусский рубль** |
| Обязательное условие аукциона | Вовлечение в хозяйственный оборот в течение 3 лет | | |
| **Сведения о продавце:** ОАО «Белая Ромашка», г. Слоним, ул. Коссовский тракт, 100, тел. 8 (01562) 4 13 87 | | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 30 дней после проведения торгов. **Оплата:** по договоренности сторон | | | |
| **Торги состоятся 2 ноября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | **По 29 октября 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте www.fincentr.by, телефоны для справок: 8 (0152) 74 49 11, 77 23 79 | | | |
| Предыдущая публикация: газета «Звязда» от 11.09.2018 года | | | |


## Надвор'е

# Сезон шалікаў і пальчатак

**На выхадныя замаразкі ўначы і 7—12 цяпла ўдзень**

**Цёплы антыцыклон, які падарыў нам сонечнае надвор'е, адступае на тэрыторыю Паволжа. А ў апошні дзень працоўнага тыдня да нас у краіну пачне паступаць больш халоднае паветра паўночных шырот. У гэтыя выхадныя дні дажджоў будзе няшмат, але тэмпературны фон істотна панізіцца, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і ўдзень у некаторых раёнах па паўднёвым захадзе магчымы невялікія дажджы. Уначы і раніцай у некаторых раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад 1 да 8 градусаў цяпла, па поўначы магчымы замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень прагназуецца ад плюс 7 да плюс 13 градусаў, па поўдні — да 15 цяпла. У нядзелю будзе пераважна без ападкаў, толькі ў некаторых раёнах па паўднёвым захадзе краіны магчымы невялікія дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы 1—6 цяпла, месцамі, пераважна па паўночным усходзе краіны, замаразкі да нуля — мінус 3 градусаў. Днём будзе ад плюс 6 да плюс 12 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак уначы будзе без ападкаў. А днём атмасферны фронт, які перамяшчаецца з паўночнага захаду Еўропы, абумовіць па паўночным захадзе краіны кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі туман. Уначы на большай частцы тэрыторыі чакаюцца замаразкі да нуля — мінус 4, у некаторых раёнах мінімальная тэмпература паветра не апусціцца ніжэй 1—4 цяпла. Удзень прагназуецца ад плюс 6 да плюс 13 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Ну і ну!

# У кантэйнеры для смецця — 5,4 тысячы долараў

**Менавіта ў кантэйнеры знайшла грошы прыбіральшчыца сталічнага гаражнага кааператыва.**

У міліцыю звярнулася мінчанка з заявай аб тым, што яна выявіла буйную суму грошай. Правааахоўнікам жанчына растлумачыла, што, прыйшоўшы раніцай на працу, прыступіла да прыборкі ў гаражным кааператыве «Малінаўка». Пры зборы смецця яна ўбачыла пачак грошай. Агульная сума знаходкі склала 5,4 тысячы долараў ЗША. Жанчына стала пытацца ва ўладальнікаў гаражоў, ці не гублялі яны грошы. І пасля таго як гаспадар не быў знойдзены, звярнулася ў міліцыю з просьбай устанавіць уладальніка і перадаць яму знаходку.

Супрацоўнікам міліцыі жанчына прызналася, што думак прысвоіць грошы ў яе нават не ўзнікала. Маскоўскі РУУС г. Мінска праводзіць праверку з мэтай устанаўлення ўладальніка знойдзенай сумы і просіць адгукнуцца тых, хто мае інфармацыю пра асобу гаспадара валюты.

# Дзіця зачынілася ў аўтамабілі

**Ранкам ратавальнікі Жлобінскага раённага падраздзялення МНС выехалі па паведамленні аб неабходнасці аказання дапамогі па ўскрыцці дзвярэй легкавога аўтамабіля, у якім знаходзілася малалетняе дзіця. Такая сітуацыя склалася на вуліцы Першамайскай у Жлобіне.**

На месцы ратавальнікі даведаліся, што бацька дзіцяці завёў легкавік «Форд Фіеста», пасадзіў туды дачку 2017 года нараджэння на пярэдняе сядзенне і пайшоў ачышчаць лабавое шкло. У гэты час дзіця націснула кнопку і заблакіравала ўсе дзверы ў аўтамабілі. Работнікі МНС пры дапамозе шанцавага інструмента ўскрылі дзверы машыны. Дзіця ва ўзросце 1 года і 8 месяцаў не пацярпела, патрэбы ў медыцынскай дапамозе не было.

# Ноччу выкраў з крамы пяць ноўтбукаў

**У аператыўна-дзяжурную службу Савецкага РУУС г. Мінска паступіла паведамленне аб тым, што ў адной з крам, якая гандлюе тэхнікай, спрацавала сігналізацыя. Па прыбыцці міліцыянераў на месца здарэння былі выяўлены крадзеж пяці ноўтбукаў.**

У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў зламыснік быў устаноўлены: ім аказаўся беспрацоўны раней судзімы 34-гадовы мінчанін, які жыве побач з крамай. Як аказалася, малады чалавек даўно выношваў думкі аб крадзяжы тэхнікі. Уначы ён пракраўся ў краму і прыхапіў пяць ноўтбукаў для далейшага продажу, але паспеў збыць толькі тры, а далей у яго планы ўмяшаліся аператыўнікі. За крадзеж малады чалавек можа атрымаць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да сямі гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі, паведамілі ў Савецкім РУУС г. Мінска.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Блізкая ўлада

# ГОРАД-СПАДАРОЖНІК, АНКАЛАГІЧНЫ ЦЭНТР, «ВЁСКІ БУДУЧЫНІ»...

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ расказаў журналістам аб перспектыўных праектах рэгіёна**



Фота БелТА.

**На пачатку прэс-канферэнцыі, што прайшла ў Бераставіцкім раёне, губернатар зазначыў, што добрая дынаміка развіцця рэгіёна захавалася і сёлета. Тэмп росту валавога рэгіянальнага прадукту — самы высокі па рэспубліцы. Такога ўзроўню ў многім дасягнулі дзякуючы ўпэўненай рабоце прамысловасці, будаўнічага комплексу. Апраўдалі сябе і буйныя інвестыцыйныя праекты, рэалізаваныя на «Мастоўдрэве» і «Кранаспане». Значна вырас экспарт тавараў і паслуг. Да канца года плануецца прыцягнуць замежных інвестыцый на 80 мільёнаў долараў. Рабочых месцаў у рэгіёне ў некалькі разоў больш, чым саіскальнікаў, а сярэдняя зарплата складае за 9 месяцаў 858 рублёў. У Гродне і Астраўцы — больш за тысячу.**

**Найбольш актыўны напрамак размовы падчас прэс-канферэнцыі датычыўся сацыяльнай сферы.**

## Як забяспечваецца патрэба ў дзіцячых садках

Губернатар адзначыў, што ў гэтым кірунку зроблены значны рывок. Толькі сёлета ўзведзена чатыры сучасныя дзіцячыя садкі з басейнамі — агульнай колькасцю на тысячу месцаў. Гэта дазволіла значна знізіць напружанасць недахопу месцаў у садках у крокавай даступнасці ў Шчучыне, Навагрудку, Астраўцы і мікрараёне Альшанка абласнога цэнтра. Налета плануецца пабудаваць садкі на 230 месцаў у Лідзе і Гродне. За кошт рэспубліканскага бюджэту плануецца будаўніцтва ў наступным годзе дзіцячых ясляў-садкоў у горадзе атамшчыкаў.

Сур’ёзная рэканструкцыя чакае дашкольную ўстанову ў Ашмянах. У рамках тэхнічнай дапамогі ЕС накіравана 500 тысяч еўра на энергазберагальныя мерапрыемствы. Частка сродкаў паступіць з абласной інвестыцыйнай праграмы ў наступным годзе.

## Ці будзе анкалагічны цэнтр у Гродне?

Патрэба ў такой установе даўно наспела, падкрэсліў Уладзімір Краўцоў. У Гродзенскай вобласці на ўліку стаіць 26 тысяч анкахворых, якія вымушаны ездзіць у Брэст альбо ў Мінск. Захады па стварэнні такога цэнтра ў Гродне прымаліся неаднаразова. На жаль, не спраўдзіліся спадзяванні па ўзаемадзеянні дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Праблема будзе вырашацца паступова. Да канца года плануецца завяршыць падрыхтоўку праекта рэканструкцыі комплексу будынкаў абласной бальніцы пад анкалагічны дыспансер. На наступны год, згодна з інвестыцыйнай праграмай, будзе выдзелена 10 мільёнаў рублёў, каб можна было распачаць работы. Паралельна плануецца адкрыццё крэдытнай лініі з арабскімі інвестарамі. Па падліках аблвыканкама, на ўвядзенне аб’екта патрэбна каля 100 мільёнаў долараў, палова з якіх — гэта кошт абсталявання. Праект падзелены на чатыры чаргі і разлічаны да 2020 года.

## Як развіваецца горад-спадарожнік

Новы статус горад Скідзель атрымаў чатыры гады таму. За гэты час зроблена нямала. Папершае, распрацаваны і зацверджаны генеральны план горада да 2025 года, у якім важнае месца адводзіцца пабудове жылля. За мінулы час уведзена ў эксплуатацыю 30 тысяч жылых «квадратаў». Шматпавярховы дом на 105 кватэр з’явіўся летась, вядзецца будаўніцтва яшчэ двух дамоў на 112 і 84 кватэры. Уладзімір Краўцоў паведаміў, што жыллёвы фонд павінен павялічыцца на 260 тысяч квадратных метраў.

Значная ўвага ўдзяляецца сацыяльнай сферы. Сёлета пачнуцца работы па рэканструкцыі самай вялікай школы ў горадзе, дзе вучацца 500 хлопчыкаў і дзяўчатак. Работа будзе завершана ў наступным годзе. Яшчэ праз год — у 2020-м — будзе пабудаваны дзіцячы садок. Падрыхтаваны праект рэканструкцыі стадыёна.

Новыя ачышчальныя збудаванні цукровага камбіната знялі праблему непрыемнага паху вакол горада. Вядзецца будаўніцтва такога ж гарадскога камунальнага аб’екта. У горадзе-спадарожніку актыўна развіваецца малы і сярэдні бізнес, рэалізуецца шэраг інвестыцыйных праектаў. Напрыклад, сёлета павінен быць завершаны праект з індыйскай кампаніяй па ўвядзенні завода медыцынскіх прэпаратаў.

Вядзецца абгрунтаванне магчымасці пераводу ў Скідзель шэрагу гродзенскіх прадпрыемстваў.

## Вызначана «вёска будучыні». Хто на чарзе?

Першай ластаўкай рэспубліканскага праекта стаў аграгарадок Абухава Гродзенскага раёна. Гэта цэнтр адной з самых паспяховых сельскіх гаспадарак рэгіёна. Сёлета прадпрыемства перайменавана ў гонар былога старшыні — Героя Сацыялістычнай Працы, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Ілы Сянько, які амаль паўстагоддзя кіраваў гаспадаркай. Менавіта з дапамогай калгаса змяняўся воблік аграгарадка, які сёння мае ўсю неабходную інфраструктуру для камфортнага пражывання.

Уладзімір Краўцоў паведаміў, што зацверджаны генеральны план развіцця «вёскі будучыні», ён прайшоў грамадскае абмеркаванне, робяцца першыя крокі па яго ажыццяўленні. У найбліжэйшы час будуць абноўлены фасады шматпавярховых будынкаў. Таксама ў планах будаўніцтва стадыёна.

Вызначаны аграгарадкі, якія неабходна давесці да ўзроўню «вёскі будучыні» ў якасці пілотных праектаў. Так, на чарзе на 2019 год — аграгарадок Жыровічы Слонімскага раёна, на 2020-ы — вёска Васілішкі, што на Шчучыншчыне.

Таксама вядзецца работа па праграме добраўпарадкавання пасёлкаў гарадскога тыпу. У рэгіёне вызначылі населеныя пункты з турыстычным ухілам — гэта Сапоцкін і Мір. У першую чаргу тут вядзецца добраўпарадкаванне дарог.

## Аб чым раскажуць абласныя «Дажынкі»?

У лістападзе традыцыйна будуць падведзены вынікі сельскагаспадарчага года і ўшанаваны найлепшыя работнікі і сельгаспрадпрыемствы. Сёлета абласны фестываль «Дажынкі» пройдзе ў Іўі. І хаця кліматычныя ўмовы не дазволілі атрымаць запланаваны ўраджай збожжавых, усе аграрыі спрацавалі ў поўную моц. Атрыманы нядрэнны ўраджай кукурузы і цукровых буракоў. Па сітуацыі з недаборам фуражнага збожжа прымаюцца адпаведныя меры, падкрэсліў Краўцоў. Аблвыканкамам выдзелена пазыка прадпрыемству «Лідахлебапрадукт» у памеры 4 мільёны рублёў для закупкі збожжа і кампенсацыі камбікармоў. На гэтыя мэты будзе ўзяты крэдыт у ААТ «Беларусбанк». Чакаецца падтрымка з боку дзяржаўнага матэрыяльнага рэзерву ў памеры 50 тысяч тон збожжа. Прымаюцца іншыя захады, каб не дапусціць зніжэння пагалоўя жывёлы і птушкі, а таксама іх прадукцыйнасці.

Што датычыцца падрыхтоўкі да «Дажынак», многае зроблена па добраўпарадкаванні Іўя. І хаця кожны райцэнтр і горад марыць прыняць у сябе фестываль, тут ёсць свая чарга. Напрыклад, налета «Дажынкі» пройдуць у Смаргоні, а яшчэ праз год — у горадзе-спадарожніку Скідзелі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# «І ПАГАВАРЫЎ, І КАПЕЙЧЫНУ ЗАРАБІЎ»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

— Добры ўраджай?

— Вой... Яблыкі пластом зямлю ўсыпалі. А груш — ніколі не было столькі. Сяджу ў гародзе, чую толькі, як у суседа галінка — «хрусь» — пад цяжарам груш абвалілася. Прыязджайце да мяне на лецішча, там добра — сапраўдны рай!

— Не цяжка стаяць на рынку?

— Не, люблю. Пахаць трэба! — кажа 78-гадовая пенсіянерка, якая за сваё жыццё паспела папрацаваць і ў бары, і на заводзе, і ў аптэцы. — Дачка не пускае, а я ўцякаю ўсё роўна. Дый весялей тут у кампаніі. І пагаварыў, і капейчыну зарабіў. А дома здурнець можна аднаму.

Калі пасля працоўнага дня засталася нераспрададзеная агародніна, яе можна здаць у камеру захоўвання. Цана за суткі — пяць капеек за кілаграм.

Аляксандра Захараўна наогул не любіць сядзець на месцы. Ездзіць па санаторыях, часам па два разы на год на аздараўленні бывае.

Людміла Мікалаеўна Макарэвіч свой ураджай прывезла з Самахвалавіч (Мінскі раён). Яблыкі, грушы, кабачкі, гарбузы, каліна... Муж на машыне дастаўляе тавар на рынак, а жанчына ўжо стаіць за прылаўкам — з сямі раніцы да шасці вечара.

— Чаму дзеці не дапамагаюць? Ды мы самі спраўляемся, нам тут цікава, — усміхаецца.

Былы майстар ЖЭС прызнаецца, што спачатку саромелася быць прадаўцом. А потым прывыкла.



**Канстанцін Пятровіч ДУДАРЧЫК прыязджае раз на тыдзень з Пухавіцкага раёна.**

— Каштэль вельмі смачны, частуйцеся, — прапаноўвае. Заўважае, што пакупнікі любяць салодкія яблыкі і абавязкова таварнага выгляду. Як вырасціць такія? Старанна даглядаць, коратка адказвае Людміла Мікалаеўна.

— У гэтым годзе грушы добра купляюць. У нас ёсць дэсертны сорт — адна такая груша паўкіло важыць. А вунь які гарбуз прыгожы, — жанчына кладзе велізарны плод на вагу. — 14 кілаграмаў!

Сама яна ўжо наставіла на зіму нарыхтовак. З гарбуза і яблыкаў націснула соку, з кабачкоў і памідораў зрабіла салату.

На адным з радоў гандлюе Канстанцін Пятровіч Дударчык. Падпісчык «Звязды», дарэчы. Ён жыве ў Пухавіцкім раёне. Раз на тыдзень прыязджае на Камароўку на электрычцы.

— Чаму не ў Пухавічах прадаю? Колькі там тых людзей, — махае рукой. — А тут зусім іншы рынак.

Участак у Канстанціна Пятровіча — цэлы гектар. Шчыруюць там усёй сям’ёй. Сёння пенсіянер узяў на продаж хрэн, кроп, перац чылі, фасолю...

— Часнок каштуе 50—70 капеек за галоўку. Танна? Дык купляйце!

— А гарбузы маленькія дэкаратыўныя? — пытаемся пра плады памерам з далонь.

— Ядомыя! — запэўнівае.

Пенсіянер раней працаваў на Галоўпаштамце. Прызнаецца, ніколі не думаў, што пойдзе ў гандаль. «Эх, ляжаць бы на печы, — уздыхае. — Але трэба грошы зарабляць».

Каб пажылым людзям атрымаць бясплатнае месца на рынку, трэба мець пры сабе пэўныя дакументы. Гэта пенсійнае пасведчанне ці пасведчанне інваліда, даведка з сельсавета аб тым, што сельскагаспадарчая прадукцыя вырашчана пенсіянерам ці яго сваякам, флюараграфія і заключэнне лабараторыі.

У сярэднім на Камароўцы ў дзень бывае 40—60 такіх прадаўцоў. Улетку па пятніцах і суботах гэта колькасць даходзіла да ста.

Чаму ж, нягледзячы на простыя ўмовы, многія бабулі і дзядулі працягваюць гандляваць на прыпынках і ў падземных пераходах? Магчыма, справа ў тым, што там стаяць неабавязкова вытворцы і гэтым прадаўцам праз кожныя паўгадзіны прадпрымальнік падвозіць прадукты. Такі ценявы бізнес.

Бясплатныя месцы для пенсіянераў і інвалідаў будуць выдзяляцца да 1 снежня.

— У лістападзе працуем пры ўмове, што тэмпература навакольнага асяроддзя не апусціцца ніжэй нуля градусаў. На крытым рынку бясплатных месцаў няма — плошчы не дазваляюць. Дый да зімы ўсе звычайна ўжо ўраджай распрадаюць, — каменнтуе **Анжэла БАРАНОВІЧ, начальнік службы арганізацыі рыначнага гандлю Камароўскага рынку.**

Цэны, якія выстаўляюць пажылыя гандляры, адміністрацыя не рэгулюе. «Гэта іх права, пачым прадаваць тавар».

Бясплатныя месцы на рынку размяркоўваюцца ў парадку чаргі. Хто раней прыйшоў, той і заняў. На месяц ці на сезон, напрыклад, канкрэтнае месца за пенсіянерам не замацоўваецца.

У адміністрацыі дадаюць, што такога, каб камусьці адмовілі з-за недахопу плошчаў, яшчэ не было. Вось і сёння шмат прылаўкаў пустуе. Калі ж попыт з боку пажылых прадаўцоў будзе вялікі, адміністрацыя гатова паставіць дадатковыя сталы.



**Ураджай сёлета як ніколі добры.**

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**




## ЧЫСТАЯ... НЯЧЫСТАЯ

Здарылася гэта ў маім далёкім дзяцінстве. Неяк раз, ноччу, я прачнулася ад зусім незразумелых гукаў: нехта... хадзіў па хаце. Ды не проста, а з падскокамі, зрэдчас прыціхаючы — нібыта ў развазе, куды б гэта падацца?

Я вельмі спужалася, прыціснулася да мамы, спытала шэптам:

— Што гэта?

— Нічога страшнага, — стала супакойваць яна.

«Ага, нічога...» — думала я, затаіўшыся і чуючы, што істота... пачала набліжацца да нашага ложка, а потым і наогул — залезла пад яго, гэта значыць, пад нас (!)...

Ледзь жывая ад жаху, я чакала нейкіх новых рухаў, але іх болей не было: тая істота, здаецца, знікла? А таму паспакайнела і я, можа, нават задрамала б, калі б яна не аб'явілася зноў: не тузануў... сяннік, на якім мы спалі.

Мама, раз-пораз паўтараючы «Сыдзі, нячыстая!», стала хрысціцца, і гэтым паддаваць яшчэ болей жаху, бо сыходзіць той нячысцік зусім не збіраўся. Ён, то з нейкім піскам, то з сапеннем, тузаў сяннік яшчэ з большай сілай...

Добра было б запаліць лучыну (да электрычнасці ў той час, як да сонца...). Але ж для гэтага трэба злезці з ложка, падысці да печы, вышукаць там жару (запалак мы таксама не мелі)...

І, вядома ж, не мелі смеласці. А ў выніку так і не заснулі, аж да раніцы пратрэсліся ў ложку.

Нячысціка ўбачылі, калі развіднела. Ім аказалася... маленькае трусяня. Вечарам я сама прынесла яго ў хату, а аднесці назад — забылася. Вось яно, прагаладаўшыся, і пачало шукаць сабе ежу, падскокваць да сена, якое пахла яму праз дзіркі ў сенніку.

Таму праўду кажуць: баязліваму і корч — мядзведзь. Аб гэтым трэба памятаць, бо ў жыцці бывае ўсякае і супакойваць сябе нечым трэба.

**Марыя Бяжан,** *г. Чэрвень.*

## «МАЛАДЫ АГРАНОМ»

Канчаецца, на жаль, сельскагаспадарчы, дачны сезон. Многіх сёлета ён парадаваў добрымі ўраджаямі, многім пакінуў светлыя ўспаміны.

...Сястра, неяк пазваніўшы, спытала, ці ёсць у мяне агуркі? Кажу, што ёсць, але мала, бо ўжо канчаюцца.

— А ў мяне, — яна хваліцца, — сямы збор.

— Чаму так позна? — пытаюся.

— Ды ўнук дапамог, — смяецца яна і расказвае, што вясной, як і ўсе, пасеяла агуркі, дачакалася завязі, прыезду ўнукаў і ўжо з імі пайшла ў гарод, узнялся там рваць пустазелле.

Малыя таксама без справы не сядзелі. Хай не адразу, але ж «знайшлі» градкі з агуркамі, патапталіся, нарвалі па жменьцы жоўтых кветачак і да бабулі: палюбуйся, маўляў, якія прыгожыя.

Тая ледзь не самлела, але што ты будзеш рабіць — дзеці... Адзінае, сказала малым, што агуркоў цяпер доўга чакаць давядзецца.

Потым той жа бядой падзялілася з суседкай. А яна вазьмі ды ўспомні (пры ўнуках), што свякроў яе казала: каб агуркі ўрадзілі, каб пустацвету не было, трэба, маўляў, хлопчыка малога на градкі пусціць — хай пабегае там, прычым без штонікаў.

Пагаварылі жанчыны вось так ды і разышліся.

Сястра назаўтра прачнулася, — бачыць, унука ў ложку няма. Кінулася ў хаце яго шукаць, а малы тым часам з двара вяртаецца, кажа:

— Бабулечка, ідзі ў гарод, паглядзі, можа, там агурочкі з'явіліся. Я вакол градак ужо пабегаў.

...Вось такія ў сястры падрастаюць памочнікі.

**Лілія Скіндзер,** *г. Івацэвічы.*

## ПАМЯТНЫ ПІКНІК

Медыкам, міліцыянерам ды ратавальнікам без жартаў не абысціся, бо менавіта яны добра здымаюць стрэсы, а смех і наогул дае сілы жыць, працаваць далей.

Дык вось неяк летам следчыя аднаго з раённых аддзелаў унутраных спраў вырашылі пасядзець вечарком на беразе вадасховішча, прычым гэтым разам не сваёй, чыста мужчынскай, кампаніяй, а разам з жонкамі.

Тыя, ну вядома ж, пастараліся, нарыхтавалі розныя смакаты, папрыбіраліся... У выніку ўсім за сталом было сытна і весела, кампанія сядзела хораша і доўга. Але ж тым часам ноч агарнула — пара па дамах, бо заўтра ўсім на працу.

Першы выправіўся ў дарогу начальнік аддзела. Ну, вядома ж, на машыне ды за рулём не сам — іншы супрацоўнік, прычым цвярозы, як шкельца (малады, не «абарзеў» пакуль). Але ж на дарогу выехаў і на табе: чалавек ляжыць — ногі на ўзбочыне, галава на шашы. Нехта, значыць, збіў бедалагу?

Мужчыны спыніліся, выйшлі з машыны, каб паглядзець, ці не трэба дапамога.

Пацярпелы, бачаць, у шапцы (пабач — пляма крыві), у ватоўцы, у гумовіках. Няйначай рыбак? Кранулі, а там... муляж, набіты нейкай саломай.

З палёгкай уздыхнулі, ссунулі яго ў канаву, смеючыся, пакіравалі дамоў...

**6.10, 17.50** Трынаццаць сяброў Оўшэна (16+).
**8.25** Будзь маім хлопцам на пяць хвілін (16+).
**10.10** Ілюзія падману-2 (16+).
**12.35** Разня (16+).
**14.10** Ключ ад усіх дзвярэй (16+).
**16.05** З рэчамі на вылет! (16+).
**20.10** Шпіён па суседстве (12+).
**22.00** Спяшайся кахаць (12+).
**0.00** Леў (16+).
**2.15** Эд з тэлевізара (12+).
**4.25** Маёмасць з хвастом (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Мой хлопец — анёл (16+).
**8.15** Населены востраў (12+).
**10.35** Агні вялікай вёскі (12+).
**12.20** Вольны вецер. 2-я серыя (6+).
**13.50** Край (16+).
**16.20, 4.00** Асколкі шчасця-2 (12+).
**18.25** Рэальны тата (12+).
**20.20** Населены востраў: схватка (12+).
**22.25** Хутчэй за трусоў (16+).
**0.20** Духless (18+).
**2.30** Спарта (16+).

### Discovery

**6.00** Найбуйнейшы ў свеце рамонт (16+).
**6.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**7.40** Займальная навука (16+).
**8.05, 13.25** Неверагодны доктар Пол (16+).
**9.35, 14.10, 2.20** Дзікі тунец (16+).
**10.20, 21.10, 3.10** Аўта-SOS (12+).
**11.05** Золата Юкана (16+).
**11.50** Ледзяная дарога (16+).
**12.40** Гаспадары гор (16+).
**15.40, 19.35** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**18.00, 22.00, 1.35** Секунды да катастрофы (16+).
**18.45** «Зялёныя героі» Джэкі Чана (16+).
**23.10** Гарачыя граніцы: Лацінская Амерыка (16+).
**0.00** Гісторыя пра нас (16+).
**0.40** Асушыць акіян (16+).
**3.55** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**4.45** Рэальнасць ці фантастыка? (16+).

### National Geographic

**8.00, 16.00, 22.00** Махінатары (12+).
**9.00, 17.00, 23.00, 4.40** Бітвы робатаў (12+).
**10.00, 15.30** Як гэта ўстроена? (12+).
**11.00, 20.00, 5.30** Склады: бітва ў Канадзе (16+).
**12.00, 18.00, 1.00, 7.10** Не спрабуйце паўтарыць (16+).
**13.00** Забытая інжынерыя (16+).
**14.00** Як устроены Сусвет (12+).
**15.00** Скрозь прастору і час (12+).
**19.00** Узрываючы гісторыю (12+).
**21.00** Як гэта зроблена? (16+).
**0.00** Залатая ліхаманка (16+).
**2.00** Што магло пайсці не так? (16+).
**2.55** Разбуральнікі легенд (16+).
**3.50** Як устроены Сусвет (12+).
**6.20** Хуткія і гучныя (16+).

НАРМАТВОРЧАСЦЬ

# НОВЫЯ РЭЗЕРВЫ ДЛЯ ЗБЛІЖЭННЯ

**Пяты форум стаў самым маштабным як па колькасці ўдзельнікаў, так і па падпісаных паміж расійскімі і беларускімі партнёрамі кантрактаў і пагадненняў. Гэта яскравае сведчанне таго, што ў плане гарманізацыі і ўніфікацыі нашых заканадаўстваў мы ўпэўнена рухаемся наперад. Тым не менш белых плям, якія перашкаджаюць грамадзянам нашых краін адчуваць сябе на роўных, яшчэ хапае. На секцыі «Уніфікацыя і гарманізацыя заканадаўства Саюзнай дзяржавы як асновы эфектыўнага і плённага беларуска-расійскага супрацоўніцтва» абмеркавалі найбольш прыярытэтныя кірункі па інтэграцыі і механізмы рашэння праблем. У цэнтры ўвагі былі пытанні пенсійнага забеспячэння, адукацыі, медыцыны, гандлю, эканомікі і іншыя. Каардынавалі работу секцыі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала БОДАК і першы намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па канстытуцыйным заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Людміла БОКАВА.**

## Асаблівасці пенсійнай палітыкі

Прыкладам плённага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі з'яўляецца выпрацоўка агульных падыходаў у заканадаўстве па ахове працы. Сёння ў Беларусі і Расіі на падобных прынцыпах пабудавана работа службаў аховы працы, арганізацыя навучання, інструктаж. Існуюць адзіныя падыходы да расследавання няшчасных выпадкаў на вытворчасці.

**Міністр працы Рэспублікі Беларусь Ірына КАСЦЕВІЧ** звярнула ўвагу на тое, што многае дасягнута ў плане працоўнага заканадаўства, але ёсць яшчэ



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

шмат праблем, звязаных з пенсійным забеспячэннем, асабліва, што датычыцца ўліку стажу. Беларусы і расіяне сёння маюць роўныя правы на працаўладкаванне на тэрыторыі абедзвюх краін. Дзякуючы міжнародна му дагавору аб супрацоўніцтве Беларусі і Расіі ў галіне сацзабеспячэння выпрацаваны парадак узаемадзеяння кампетэнтных органаў дзвюх краін па выплатах пенсій. Але ў Беларусі, напрыклад, усе працуючыя, у тым ліку расіяне, заўсёды падлягалі абавязковаму сацыяльнаму страхаванню, а ў Расіі такая норма для беларусаў дзейнічае толькі з 2012 года. Акрамя гэтага, у 2015 годзе ў пенсійнае заканадаўства Расіі былі ўнесены змяненні, якія прадугледжваюць пры вызначэнні пенсіі індывідуальны каэфіцыент. І ён улічвае толькі тыя страхавыя ўзносы, якія пералічаны ў страхавы фонд Расіі. Тое, што чалавек працаваў у Беларусі, не ўлічваецца. Зараз абодва бакі працуюць над карэкціроўкай гэтай нормы дагавора.

## Агульная адукацыйная прастора

**Намеснік міністра адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі Ірына ПАЦЕХІНА звярнула ўвагу на важнасць падрыхтоўкі кадраў для Саюзнай дзяржавы:**

— На сёння існуе болей за 750 пагадненняў у сферы адукацыі на міжурадавым, міжрэгіянальным, міжведамасным і міжвузаўскім узроўнях. Сумесная работа накіравана на павышэнне якасці адукацыі і стварэнне роўных умоў для грамадзян Расіі і Беларусі. Разам з тым у заканадаўствах нашых краін ёсць яшчэ шмат адрозненняў. Напрыклад, пытанне аб узаемным прызнанні адзінага дзяржаўнага экзамену ў Расіі і ЦТ у Беларусі вырашана, але ў гэтых сістэм ёсць прынцыповыя адрозненні. Адзіны дзяржаўны экзамен з'яўляецца выніковым і пры заканчэнні школы, і пры паступленні ў іншыя навучальныя ўстановы, а ў Беларусі ЦТ — гэта форма ацэнкі толькі ўступных экзаменаў. Ацэначныя сістэмы адрозніваюцца і па структуры, і па змесце, і па прызначэнні.

Зараз перад сістэмамі адукацыі ёсць патрабаванні ў выхаванні кадраў будучага дня. Трэба валодаць высокімі кампетэнцыямі ва ўсіх галінах эканомікі, а гэта патрабуе павышэння якасці агульнай адукацыі, мадэрнізацыі прафесійнай адукацыі і гэтак далей. Вялікую ролю адыгрывае ў аб'яднанні рух WorldSkills. Для сумеснай работы і стварэння агульнай адукацыйнай прасторы трэба выкарыстоўваць новыя лічбавыя магчымасці.

## За гандаль без абмежаванняў

Балючую тэму прасоўвання беларускіх тавараў і паслуг на тэрыторыі Расіі закрануў **намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Андрэй КАРТУН:**

— Асноўнай мэтай дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (ЕАЭС) з'яўлялася свабоднае перамяшчэнне тавараў і праводзенне адзінай палітыкі. Шмат у чым заканадаўства ўніфікавана, але што датычыцца пропуску тавару на нацыянальныя рынкі, гэта пытанне застаецца нявырашаным, нягледзячы на спробы разабрацца з ім на розных пляцоўках, у тым ліку Саюзнай дзяржавы. Сёння налічваецца каля 70 перашкод у межах адзінага саюза, за 2018 год колькасць іх толькі вырасла. Адсутнасць адзінага падыходу прыводзіць да абмежавальнага характару закупак. Адным з бар'ераў допуску беларускіх пастаўшчыкоў да ўдзелу ў закупках Расійскай Федэрацыі з'яўляецца неабходнасць атрымання адзінага лічбавага подпісу. Для гэтага трэба стаць рэзідэнтам Расійскай Федэрацыі. І такіх праблем шмат.

**Намеснік міністра аховы здароўя Валерый ШАЎЧУК** заваструў увагу на праблемах па стварэнні аб'яднанай базы лекавых сродкаў у рамках Саюзнай дзяржавы і ЕАЭС.

— Агульны рынак лекаў павінен запрацаваць з 2025 года, але пры ўзаемнай зацікаўленасці гэта магло б адбыцца ўжо праз два гады, — падкрэсліў намеснік міністра. — Але пакуль няма правапрымяняльнай практыкі ўсіх гэтых дакументаў і не распрацаваны шэраг асноватворных дакументаў, у тым ліку — закона аб фармакапіі. А яшчэ мы сутыкнуліся з цікавым фактам: у Расіі прадстаўнікі фармбізнесу не вельмі імкнуцца працаваць з таннымі лекамі. І гэта таксама праблема.

Удзельнікі пасяджэння таксама казалі пра тое, што ўніфікацыя і гарманізацыя не павінны перашкаджаць самастойнасці кожнай асобна ўзятай краіны. Не трэба займацца калькаваннем законаў, неабходна ствараць мадэльныя законы ў межах існуючай Саюзнай дзяржавы і там агаворваць аднолькавыя нормы для Беларусі і Расіі.

У выніковым дакуменце адзначаны кірункі па далейшай гарманізацыі і ўніфікацыі законаў. Органам мясцовага кіравання і самакіравання Рэспублікі Беларусь, заканадаўчым (прадстаўнічым) і выканаўчым органам дзяржаўнай улады суб'ектаў Расійскай Федэрацыі, органам мясцовага самакіравання Расійскай Федэрацыі прапанавана ў шчыльным узаемадзеянні адно з адным і дзяржаўнымі органамі Расіі і Беларусі садзейнічаць пытанням інтэграцыі і рэгулярна ўносіць прапановы па вырашэнні існуючых праблем у двухбаковых адносінах.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала БОДАК:**



Фота Тацяны ТКАЧОВАЙ.

— У нас з Расіяй напрацавана каля 200 міжнародных пагадненняў — надзейны прававы падмурак для далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы. Мы дасягнулі высокага ўзроўню ў плане Мытнага заканадаўства, аналага такога супрацоўніцтва няма на ўсёй постсавецкай прасторы. Развіваецца рэгіянальная інтэграцыя — гэта брэнд сучаснасці. Вельмі важна, каб міністэрствы і ведамствы Беларусі і Расіі мелі сумесныя планы супрацоўніцтва і каб яны развіваліся. За пяць апошніх гадоў напрацавана грунтоўная база. Міністэрствы юстыцыі дзвюх дзяржаў шмат чаго зрабілі для выканання судовых рашэнняў, якія датычыцца грамадзян дзвюх краін. Вялікі патэнцыял ёсць у рабоце сумесных сектаральных рабочых груп, аб'яднаных калегій — гэта і надалей трэба працягваць практыкаваць. Але пры гэтым павінна быць каардынацыйная роля Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.

Паколькі нам патрэбна адзіная эканамічная прастора, заканадаўствы Беларусі і Расіі павінны працаваць ва ўнісон.

**Першы намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па канстытуцыйным заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Людміла БОКАВА:**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Перш за ўсё павінна быць прававая аснова ў дачыненні да грамадзяніна, сям'і. Прыйшоў час, калі можна казаць, што распрацаваная Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы канцэпцыя збліжэння саспела для таго, каб яе зацвердзіць і намеціць паслядоўныя крокі яе рэалізацыі. Для нашай сумеснай дзейнасці неабходна пашырэнне навукова-экспертнага дыялогу па актуальных пытаннях Саюзнай дзяржавы. Уся аналітыка, высновы не павінны ляжаць мёртвым грузам, трэба гэта абмяркоўваць у межах нашага заканадаўства.

# Акцэнт на інавацыі

«Тэма эканамічнай бяспекі актуальная не толькі для Саюзнай дзяржавы, але і для ўсяго свету. Мы павінны хутка навёрстваць упушчанае перш за ўсё ў мікраэлектроніцы, біятэхналогіях, у галіне штучнага інтэлекту. Патрэбна стратэгія доўгатэрміновага супрацоўніцтва і сучасныя праекты», — такое меркаванне агучыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ,** адзін з мадэратараў секцыі «Міжнародная дзейнасць і эканамічная бяспека», пасяджэнне якой адбылося ў рамках V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Яе ўдзельнікамі сталі прадстаўнікі ІТ-цэнтраў, дзелавых і навуковых колаў дзвюх краін. Спецыялісты абмеркавалі асноўныя кірункі беларуска-расійскага супрацоўніцтва на міжнароднай арэне, актуальныя пытанні забеспячэння эканамічнай і інфармацыйнай бяспекі Саюзнай дзяржавы і іншыя тэмы.

Сваім бачаннем павышэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі Саюзнай дзяржавы за кошт высокатэхналагічных і навукаёмістых вытворчасцяў падзяліўся генеральны дырэктар навукова-вытворчага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «АДАНІ» Уладзімір Лінёў. Дарэчы, прадпрыемства, якое ён узначальвае, займаецца вытворчасцю высокатэхналагічнай лічбавай рэнтгенаўскай тэхнікі ў Беларусі. Гэта адзін з сусветных лідараў у стварэнні і ўкараненні навукаёмістых прарыўных, рэвалюцыйных інавацый у сегменце рынку рэнтгенаўскага абсталявання.

Будучыня Саюзнай дзяржавы залежыць ад кадравага патэнцыялу, ад той моладзі, якая сёння асвойвае азы будучых прафесій ва ўстановах адукацыі Беларусі і Расіі. «Фарміраванне адзінай адукацыйнай і навукова-тэхналагічнай прасторы ў рамках Саюзнай дзяржавы — адзін з галоўных кірункаў саюзнай палітыкі», — падкрэсліў **загадчык кафедры тэхналогіі праграмавання факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандр КУРБАЦКІ.**

Сярод прычын, якія сёння запавольваюць развіццё інфарматызацыі Саюзнай дзяржавы, спецыялісты называюць адсутнасць дастатковай матывацыі для ўкаранення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, недастатковы ўзровень інвестыцый у ІТ-сферу, няпоўнае выкарыстанне магчымасцяў дзяржаўна-прыватнага партнёрства. На думку спецыялістаў, росту інавацыйнага патэнцыялу Беларусі і Расіі будзе спрыяць пераход да стварэння лічбавых платформаў, а таксама ўзаемадзеянне рэгіёнаў у галіне выкарыстання сучасных тэхналогій, распрацоўкі і серыйнай вытворчасці навукаёмістай прадукцыі.

Пры падвядзенні вынікаў работы секцыі ўдзельнікі выказаліся за далейшае паглыбленне міждзяржаўнага супрацоўніцтва, удасканаленне механізма прававога рэгулявання навукова-інавацыйнай дзейнасці і развіццё ўзаемадзеяння навукі з рэальным сектарам эканомікі. Адной са слушных прапаноў стала рэкамендацыя разглядзець магчымасць фарміравання ў рамках Саюзнай дзяржавы органа, які б забяспечваў узгодненасць эканамічных пераўтварэнняў і вызначаў бы задачы, кірункі інавацыйнага развіцця, а таксама садзейнічаў абмену і распаўсюджванню найлепшых практык і вопыту.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ТЭХНАЛОГІІ БУДУЧЫНІ

# ВАЖНАСЦЬ «ЛІЧБЫ» Ў ЭКАНОМІЦЫ

## Найбольш перспектыўныя напрамкі для лічбавізацыі — прамысловасць, сельская гаспадарка і энергетыка

**Аб развіцці дыджытал-індустрыі ў Саюзнай дзяржаве гаварылі на секцыі «Лічбавая эканоміка: супрацоўніцтва рэгіёнаў, стан і перспектывы». Пляцоўкай для мерапрыемства стала ААТ «Магілёўскі завод ліфтавага машынабудавання».**

Тэма канферэнцыі актуальная як для Беларусі, так і для Расіі. Пацвярджэнне таму — вялікая колькасць удзельнікаў сустрэчы і амаль два дзясяткі дакладчыкаў.

Па выніках работы секцыі спецыялісты рэкамендавалі актывізаваць намаганні заканадаўчай і выканаўчай улады дзвюх краін для лічбавай трансфармацыі эканомік. Найбольш важным аспектам для Саюзнай дзяржавы з'яўляецца гарантаванне ўстойлівага функцыянавання і бяспекі адзінай інфармацыйнай прасторы. Сярод мер, якія будуць спрыяць развіццю лічбавай індустрыі, — стварэнне адзінай прававой прасторы ў сферы лічбавай эканомікі, запуск прарыўных інвестыцыйных праектаў у галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, умацаванне супрацоўніцтва гарадоў і ІТ-кампаній краін. Гэтыя палажэнні ўвойдуць у праект выніковага дакумента V Форуму рэгіёнаў.

Дагавор аб супрацоўніцтве ў галіне развіцця малых і сярэдніх прадпрыемстваў падпісалі Беларускі фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў і Фонд развіцця прамысловасці Расійскай Федэрацыі.

«Перавод эканомікі ў «лічбу» — не проста модны трэнд, гэта пытанне нацыянальнай бяспекі, калі хочаце, глабальнай канкурэнтаздольнасці. Ад гэтых працэсаў нам не варта заставацца ўбаку, каб не трапіць у за-


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

лежнасць ад сусветных лідараў лічбавізацыі эканомікі. Наша работа павінна ісці на апярэджанне», — сказаў у прывітальным слове **Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах.** Для яго гэты Форум рэгіёнаў значны. Выхадзец з Курскай вобласці, ён атрымаў адукацыю ў Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце і тут жа, на Магілёўшчыне, пачынаў сваю працоўную дзейнасць.


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Старшыня Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па эканамічнай палітыцы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ** адзначыў: «Мы сёння гаворым пра лічбавую эканоміку. Цяжка пераацаніць значэнне гэтай тэмы, але самае галоўнае — немагчыма пераацаніць значэнне тых задач, якія выцякаюць пад эгідай урадаў дзвюх нашых брацкіх дзяржаў у рамках праграм «Лічбавая эканоміка» да рэалізацыі.

Пачынаў серыю дакладаў **намеснік дырэктара па маркетынгу і развіцці ДУ «Адміністрацыя Парку высокіх тэхналогій» Аляксандр МАРЦІНКЕВІЧ.** Менавіта ў гэтай установе сканцэнтраваліся «будаўнікі» ІТ-краіны. Сёння ў ПВТ зарэгістравана 386 кампаній, у якіх працуюць больш за 35 тысяч чалавек. Актуальныя праекты, цікавасць да якіх праяўляюць рэзідэнты, рэалізуюцца ў сферы штучнага інтэлекту, вялікіх даных, стварэння сістэм беспілотнага транспарту, распазнавання вобразаў.

Аляксандр Марцінкевіч акцэнтаваў увагу на галоўных выкліках у пабудове ІТ-эканомікі ў свеце. Адзін з іх — тэхналагічны прагрэс, які хутка развіваецца (у аснове якога ляжыць лічбавізацыя): «Трэба разумець, што свет сёння стаў іншы, і хуткасць змен вельмі вялікая. Я гляджу па дзейнасці нашых кампаній: толькі ў адной з іх летась на 850 % вырас попыт на прадукты, звязаныя з ужываннем сістэм аўтаматызацыі на базе штучнага інтэлекту. Гэта сведчыць аб тым, што сёння свет расце па экспаненце».

Другі выклік датычыцца гарантавання бяспекі персанальных даных. «Ствараецца ўражанне, што сацыяльныя сеткі, мабільныя праграмы ведаюць пра нас сёння больш, чым блізкія. Калі правільна выбудаваць працэс, маючы даныя пра людзей, можна кіраваць гэтымі людзьмі», — тлумачыць Аляксандр Марцінкевіч.

Пра тое, як удасканальваюць сістэму муніцыпальнага кіравання за кошт укаранення новых тэхналогій, расказаў **Сяргей АЛТУХОЎ, намеснік старшыні Заканадаўчага сходу Краснадарскага краю.** «Зараз мы ідзём па шляху пабудовы празрыстай сістэмы дзяржаўнага кіравання, заснаванай у першую чаргу на працэсным падыходзе. Пачынаючы ад аказання дзяржаўных паслуг па жыццёвых сітуацыях (напрыклад, нараджэнне дзіцяці, змена месца жыхарства і гэтак далей) і заканчваючы інфармацыйнай сістэмай па кіраванні партфелем інвестыцыйных праектаў», — тлумачыць Сяргей Алтухоў. Акрамя таго, неабходна кансалідацыя розных ІТ-кампаній рэгіёна ў адзіную супольнасць. Тут прыкладам для расіян з'яўляецца беларускі Парк высокіх тэхналогій.

Інфарматызацыя шчыльна закранае і медыцынскую сферу. Профільнае міністэрства Беларусі сёння займаецца пабудовай нацыянальнай сістэмы электроннай аховы здароўя, якая арыентавана на патрэбы кожнага грамадзяніна.

«Электронная ахова здароўя адкрывае прынцыпова новыя магчымасці развіцця галіны. Якасна змяняюцца падыходы да мадэлі ўзаемадзеяння ўсіх удзельнікаў аказання медыцынскай дапамогі. І асновай працэсаў інфарматызацыі сістэмы аховы здароўя складзе інтэграваная электронная медыцынская карта, якая будзе стварацца пры нараджэнні грамадзяніна і суправаджаць яго на працягу ўсяго жыцця», — гаворыць **Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.** Пачынаецца гэтая работа не з нуля. Ужо сёння паспяхова працуюць сістэма электронных рэцэптаў, тэлемедыцына, галіна (як і ўся краіна) паступова пераходзіць на электронны дакументаабарот.

Праблемным момантам сёння з'яўляецца фрагментацыя ІТ-аховы здароўя. Пераадолець яе дапамогуць свабодны абмен данымі паміж установамі, укараненне адзіных інфармацыйных стандартаў, класіфікатараў.

Міністэрствам аховы здароўя распрацавана і зацверджана канцэпцыя развіцця сістэмы электроннай аховы здароўя. Пры гэтым улічвалі вопыт СААЗ, Міжнароднага саюза электрасувязі, Міністэрства аховы здароўя Расіі па інфарматызацыі медыцынскіх устаноў Санкт-Пецярбурга, Масквы і Казані.

Важнай часткай секцыі стала заключэнне пагадненняў і кантрактаў. Дагавор аб супрацоўніцтве ў галіне развіцця малых і сярэдніх прадпрыемстваў падпісалі Беларускі фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў і Фонд развіцця прамысловасці Расійскай Федэрацыі. Дагавор на пастаўку абсталявання заключылі «Магілёўліфтмаш» і вытворчае аб'яднанне НЛМ. Кантракт таксама падпісалі Гродзенскі мясакамбінат і кампанія «Смак дзяцінства».

**Марыя ДАДАЛКА.**



# СТУДАТРАДЫ, АГІТЦЯГНІК І АНЛАЙН-ПЛЯЦОЎКІ

## Моладзь Беларусі і Расіі агучыла найбольш перспектыўныя кірункі сумеснай дзейнасці

**Яшчэ да сустрэчы на пасяджэнні секцыі ў Магілёўскім універсітэце імя А. Куляшова маладыя хлопцы і дзяўчаты змаглі абмяняцца думкамі наконт сумесных праектаў, пабываць на прадпрыемствах вобласці, задаць пытанні міністру адукацыі Рэспублікі Беларусь Ігару Карпенку, заключыць пагадненні паміж рэгіёнамі. Менавіта з падсумавання вынікаў Маладзёжнага форуму і пачалася работа секцыі «Сацыяльная і грамадзянская актыўнасць моладзі Беларусі і Расіі: традыцыі і навацыі». Яе мадэратарамі выступілі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар СІРЭНКА і член Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па сацыяльнай палітыцы Таццяна ЛЕБЕДЗЕВА.**

Віктар Сірэнка адразу ж падкрэсліў вялікі патэнцыял супрацоўніцтва ў развіцці маладзёжных парламентаў:

— Моладзь нашых краін вельмі блізкая па духу, хутка знаходзіць агульную мову. Што датычыцца беларускага маладзёжнага парламента, то тут мы яшчэ ў пачатку спраў, дзесьці адстаём ад Расійскай Федэрацыі. Форум рэгіёнаў, спадзяюся, стане стымулам для развіцця парламенцкага руху, пачынаючы ад студэнцкіх грамадскіх аб'яднанняў і заканчваючы раённымі фарміраваннямі. Злёт студэнцкіх атрадаў, валанцёрскі рух — гэта ўсё тыя формы, якія могуць аб'яднаць.

**Старшыня Асацыяцыі грамадскіх аб'яднанняў «Нацыянальны Савет маладзёжных і дзіцячых аб'яднанняў Расіі» Рыгор ПЕТУШКОЎ** адзначыў важнасць стасункаў моладзі Беларусі і Расіі па ўсіх кірунках:

— Праз некалькі гадоў менавіта цяперашняя моладзь будзе працаваць ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі, і чым эфектыўней сёння выступаюць прадстаўнікі маладзёжных арганізацый, тым вышэйшы будзе ўзровень ва ўсіх сферах — ад адукацыі і медыцыны да сельскай гаспадаркі і навукі. Ёсць разуменне нашай агульнай гісторыі, традыцый. Мы разам рыхтавалі і праводзілі Сусветны форум моладзі і студэнтаў, напярэдзе ў нас шмат вялікіх сумесных мерапрыемстваў. Нам толькі трэба сінхранізаваць агульныя падыходы нашай работы. Сёння мы працуем над стварэннем стратэгіі маладзёжнай палітыкі Саюзнай дзяржавы, падпісваем пагадненні паміж рэгіёнамі.

Дарэчы, Маладзёжны форум якраз і пачынаўся шэсць гадоў таму з грамадскай ініцыятывы і ўпершыню прайшоў у Мінску. І тое, што ён дарос да маштабнага і нават атрымаў запрашэнне на, як казалі студэнты, «дарослы» Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, — сведчанне таму, што моладзь вельмі хутка інтэгруецца.

**Першы сакратар БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК** звярнуў увагу на тое, што моладзь Беларусі і Расіі мае шмат агульных інтарэсаў, а мабільныя зносіны дазваляюць ім вельмі хутка вырашаць шматлікія задачы:

— Зараз акцэнт робіцца на найноўшыя тэхналогіі, да нашых паслуг — інтэрнэт-прастора. У Беларусі створана анлайн-пляцоўка, дзе мы дзелімся ідэямі, расказваем пра свае дасягненні, ініцыятывы. Цяпер распрацоўваецца праграма, якая забяспечыць адзіную электронную сістэму членаў нашай арганізацыі. Да яе плануецца далучыць усіх актыўных, крэатыўна мыслячых маладых людзей. У нас існуе беларуская мадэль бізнес-інкубатараў, патэнцыял якой можа быць выкарыстаны ў мэтах агульных з расіянамі інтарэсаў.

Найбольш перспектыўныя шляхі маладзёжнай інтэграцыі ўдзельнікі секцыі бачаць у стварэнні агульнай медыйнай прасторы, узаемадзеяння на розных міжнародных пляцоўках, развіцці студэнцкага не ўдзельнічаць у сумесных будатрадах. Пакуль існуе толькі некалькі прыкладаў такога супрацоўніцтва, нягледзячы на тое, што ёсць вялікая зацікаўленасць.

Удзельнікі секцыі палічылі неабходным актывізаваць намаганні, накіраваныя на развіццё маладзёжнага парламентарызму і самакіравання, усталяванне кантактаў і дзелавых сувязяў паміж маладзёжнымі арганізацыямі і аб'яднаннямі дзвюх краін. Ёсць намер за кошт бюджэту Саюзнай дзяржавы распрацаваць праграму



Моладзь на фарсайт-сесіі падчас Маладзёжнага форуму Беларусі і Расіі.

і валанцёрскага руху. Больш плённаму супрацоўніцтву пакуль перашкаджаюць некаторыя несупадзенні ў заканадаўствах Беларусі і Расіі, але яны ўжо ў полі зроку. Адной з цікавых прапаноў, агучаных падчас Форуму рэгіёнаў, была ідэя стварыць сумесны агітцягнік, які б курсіраваў паміж Брэстам і Уладзівастокам. Гэта б дало магчымасць моладзі лепш пазнаёміцца, а таксама правесці шэраг карысных акцый. Але і тут трэба будзе ўрэгуляваць некаторыя юрыдычныя пытанні. Існуе ўзаемнае жаданне па рабоце з таленавітай і адоранай моладдзю, а таксама праект Стратэгіі маладзёжнай палітыкі ў рамках Саюзнай дзяржавы. Разглядаецца магчымасць стварэння пастаяннай пляцоўкі па абмене досведам паміж маладзёжнымі лідарамі і грамадскімі аб'яднаннямі маладых людзей. У планах далейшага супрацоўніцтва — заключэнне пагадненняў паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі і пашырэнне ўзаемадзеяння паміж рэгіянальнымі ВНУ ў адукацыйнай, навуковай і інавацыйнай сферах.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ФОТАФАКТ

# БІЗНЕС — ДЗЕЦЯМ

## Дабрачынны праект па рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў рэалізуецца ў Смалявіцкім раёне



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Члены пярвічнай арганізацыі «Беларускага саюза жанчын» Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу правялі выязное пасяджэнне ў сялянска-фермерскай гаспадарцы ў Мінскім раёне. Уладальнік сядзібы Мікалай Сінкавец падчас сустрэчы расказаў дэпутатам пра сацыяльна-дабрачынныя праекты, якія падтрымлівае яго сям'я. Выхаванцы Цэнтра карэкцыйна-развівальнай адукацыі і рэабілітацыі Смалявіцкага раёна бясплатна займаюцца іпатэрапіяй у фермерскай гаспадарцы. Сын Мікалая Васілевіча, Дзмітрый Сінкавец — старшыня фонду «Дарога ў жыццё», які за сродкі замежных інвестараў будуе ў раёне ўжо чацвёрты і пяты па ліку дзіцячыя дамы сямейнага тыпу.

— Дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў вельмі зацікавіў гэты сацыяльны праект, які сёння рэалізуецца на тэрыторыі фермерскай гаспадаркі. Мы ўсе ведаем, што кіраўнік нашай дзяржавы, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паставіў задачу перад грамадскімі арганізацыямі — вельмі ўважліва адносіцца да развіцця сацыяльных праектаў, накіраваных на падтрымку і прыцягненне інвестыцый для найбольш уразлівых слаёў насельніцтва (перш за ўсё дзяцей-інвалідаў), — адзначыла **Вольга ПЕТРАШОВА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня пярвічнай арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын» Палаты прадстаўнікоў.** — І ў гэтай сувязі мы сёння бачым такі цікавы і ўнікальны вопыт работы ў краіне, які паказвае сумесны сацыяльны праект дзейнасці Цэнтра карэкцыйна-развівальнай адукацыі (гэта дзяржаўная ўстанова) і прыватнага прадпрыемства, што адпавядае стратэгічным мэтам устойлівага развіцця.

Мерапрыемства праводзілася ў рамках Тыдня маці ў Рэспубліцы Беларусь.

**Марыя ДАДАЛКА.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Больш за 200 000 000 долараў

**Дэлегацыя Мінскай вобласці вярнулася з Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі з важкімі набыткамі. Аб гэтым карэспандэнту «МС» расказаў намеснік старшыні Мінаблвыканкама Мікалай РАГАШЧУК.**

***— На якую суму цэнтральны рэгіён заключыў кантракты падчас Форуму рэгіёнаў і на пастаўкі якой прадукцыі: сельскагаспадарчай, прамысловай?***

— У межах пятага Форуму заключаны кантракты на пастаўку прамысловай прадукцыі на суму 200,9 мільёна долараў ЗША. Больш таго, на рэгіянальнай пляцоўцы Мінскай вобласці ў межах мерапрыемстваў у Магілёве ў шырокім асартыменце была прадстаўлена сельскагаспадарчая прадукцыя Мінскага малочнага завода № 1, агракамбінатаў «Ждановічы» і «Дзяржынскі», а таксама — спажывецкай кааперацыі: плодаагародніна, квашанні, засолкі, ягады, грыбы, мясныя вырабы. Прадукцыя нашых прадпрыемстваў карысталася вялікім попытам не толькі ў жыхароў горада, але і ў гасцей форуму, што засведчыў рознічны тавараабарот: на гэтай пляцоўцы з 11 па 14 кастрычніка ён склаў больш за 60 тысяч беларускіх рублёў.

Адзначу, што традыцыйна тавары сталічнай вобласці пазнавальныя на расійскім рынку за кошт высокай якасці.

***— Мікалай Міхайлавіч, якія кантракты найбольш буйныя на ўзроўні вобласці, раёнаў?***

— Найбольшыя сумы кантрактаў, якія заключаны ў межах падрыхтоўкі і правядзення форуму, у БелАЗа — 90 мільёнаў, Слуцкага мясакамбіната — 14,6 мільёна, таварыства з абмежаванай адказнасцю «Вялес-Міт» — 12,4 мільёна долараў.

***— У чым карысць такіх сустрэч з расійскімі калегамі? Відавочна, не толькі ў заключэнні кантрактаў, але і ў плане асабістых зносін, абмену вопытам, супрацоўніцтва на перспектыву?***

— Штогадовае правядзенне форумаў дазваляе падтрымліваць пастаянныя сувязі паміж прадстаўнікамі вышэйшых і мясцовых органаў улады дзвюх краін, і, як адзначае Прэзідэнт Беларусі, рэалізацыя дамоўленасцяў на найвышэйшым узроўні можа быць паспяховай толькі тады, калі дапаўняецца эфектыўнай работай на рэгіянальным узроўні.

Добрым прыкладам служаць узаемаадносіны з Бранскай вобласцю, з дэлегацыяй якой адбылася сустрэча ў межах форуму. Блізкасць нашых граніц і ўзаемная зацікаўленасць у расшырэнні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва дазволіла сёлета за восем месяцаў дасягнуць тавараабароту з гэтым расійскім рэгіёнам на ўзроўні амаль 50 мільёнаў долараў.

Што датычыцца прамысловай кааперацыі, то на Браншчыну мы пастаўляем часткі для лакаматываў, чыгуначнага саставу і трамваяў, рухавікоў унутранага згарання, металаканструкцый з чорных металаў. Імпартуем адтуль вырабы з чорных металаў, насенне рапсу і шмат чаго іншага.

Узаемны інтарэс з Бранскай вобласцю ўяўляе супрацоўніцтва ў плане абмену вопытам у сферы аграпрамысловага комплексу. Дасягнуты дамоўленасці аб удзеле Мінскай вобласці ў VII Славянскім міжнародным эканамічным форуме, які адбудзецца сёлета ў Бранску 2 лістапада. Прадстаўнікі Міншчыны прымуць удзел у пасяджэнні секцыі «Рэгіянальная лічбавая платформа ў АПК». У далейшым мы разлічваем яшчэ больш эфектыўна задзейнічаць наш прамысловы і кадравы патэнцыял для стварэння сумеснай прадукцыі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Набыць паліва, пачысціць калодзеж ці атрымаць даведку...

## З якімі зваротамі штодзённа даводзіцца сутыкацца старшыні сельсавета?

**Па комплексе сацыяльна-эканамічных паказчыкаў, што былі летась, Каменскі сельскі Савет дэпутатаў стаў найлепшым. Яго старшыня Алег Пусікаў лічыць — такога выніку дасягнулі дзякуючы цеснаму ўзаемадзеянню з органамі грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання, піша Чавуская раённая газета «Іскра».**

— У рабоце з насельніцтвам дапамога сельскіх старастаў адыгрывае вялікую ролю. Яны не толькі своечасова заўважаюць праблему, падкажуць, як яе вырашыць, але і самі ўдзельнічаюць. З дапамогай старастаў збіраюцца добраахвотныя ўзносы, сёлета — 547,20 рубля, праводзіцца суботнікі па навядзенні парадку на могілках і прылдамавых тэрыторыях. У рабоце па добраўпарадкаванні дапамагаюць і супрацоўнікі арганізацый, размешчаных на тэрыторыі сельсавета, — кажа **старшыня Каменскага сельскага Савета дэпутатаў Алег ПУСІКАЎ.**

Ён перакананы, што кожны павінен усвядоміць: калі хочам, каб у населеных пунктах былі чысціня і парадак — трэба рабіць свой унёсак. Пачынаць са сваёй дваровай тэрыторыі або са свайго пад'езда.

— Большасць грамадзян гэта разумее, аднак прыходзіцца і прымаць меры адміністрацыйнага ўздзеяння. Таму праводзіцца вялікая растлумачальная работа: сельскія сходы, прыёмы грамадзян, выязныя пасяджэнні, адзіныя дні інфармавання, дні вёскі, — адзначае суразмоўнік.

Дарэчы, на добраўпарадкаванне за восем месяцаў 2018 года выдаткавана 3 167 рублёў. Наводзіцца парадак не толькі ў населеных пунктах, але і на грамадзянскіх могілках, а іх на тэрыторыі сельсавета 32. Зносяцца таксама аварыйныя дрэвы, сёлета іх было прыбрана 20. Праводзіцца работа па скарачэнні колькасці пустых старых дамоў на вёсцы: у гэтым годзе былі знесены 23 трухлявыя хаты. Зямельныя ўчасткі, што вызваляюцца такім чынам, перадаюцца на баланс мясцовага сельгаспрадпрыемства для ўключэння ў сельгасабарот альбо ўносяцца ў пералік свабодных. Гэтае пытанне ўвесь час знаходзіцца на кантролі сельвыканкама. Вялікую ўвагу ён удзяляе таксама вырашэнню праблем, з якімі вяскоўцы звяртаюцца да мясцовай улады: аказваецца садзейнічанне ў набыцці паліва, рамонце дамоў і агароджаў, чыстцы калодзежаў. Паступаюць і звароты, якія датычацца афармлення спадчыны, зямельных участкаў, атрымання розных даведак. Ні адзін са зваротаў не застаецца па-за ўвагай. Як і праца размешчаных на тэрыторыі сельсавета аб'ектаў гандлю, аховы здароўя, культуры, жыллёва-бытавыя ўмовы састарэлых адзінокіх і адзінока пражываючых грамадзян, пытанні пажарнай бяспекі і шматлікія іншыя.

**Падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.**

# НА ДАЖЫНКІ — У ЛУКАВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)*

У цэнтры вёскі побач са школай, Домам культуры, магазінам, сельсаветам вымалёўваецца плошча, якой дагэтуль не існавала. Раней тут была пустка, якую перыядычна абкошвалі.

— Гэта і было нашай галоўнай задумкай — зрабіць плошчу, разбіць сквер, дзе можна адлюстраваць некаторыя этапы нашай гісторыі і галоўную славутасць — Лукаўскае возера з яго асаблівым паўвостравам, — расказвае **старшыня сельскага Савета Алена МАРУК.** — Шмат гадоў таму людзі сяліліся менавіта каля возера, карміліся ад яго. Цяпер яно становіцца цэнтрам турызму і адпачынку, а таксама вялікім стымулам да развіцця вёскі. Зараз у нас няма пустуючых дамоў, а цана ўчастка без пабудовы даходзіць да чатырнаццаці тысяч рублёў.

Дык вось, з Лукаўскім возерам звязана шмат легендаў, паданняў нашага краю, — працягвае кіраўнік мясцовай улады. — Адна з іх расказвае аб тым, як разыгралася бура, вада выйшла з берагоў і затапіла вузкі перашыек, які звязваў паўвостраў з зямлёй, разбурыла капліцу, што стаяла на паўвостраве. Людзі былі ў роспачы і ўжо не верылі ў выратаванне. Але з развалін капліцы выйшла незнаёмка і вывела іх праз брод на сушу. Яны спыталі, як клічуць выратавальніцу. Яна адказала, што яе можна называць «Спатолі маю скруху». Гэтыя ж словы накрэслены на нашай капліцы і на ліхтары, які мы стылізавалі пад капліцу на плошчы...

На тым месцы пазней вяскоўцы пабудавалі храм. Але ў XIX стагоддзі ён згарэў. А вось абраз Божай Маці застаўся, яго лічылі цудатворным. Новы храм асвяцілі ў гонар Божай Маці, але ў 1960 годзе царкву разабралі. Наступны храм у Лукаве з'явіўся адносна нядаўна. А на паўвостраве, дзе засталіся векавыя дубы і старыя магілы, у 2010 годзе аднавілі капліцу. Гэта асаблівае месца, тутэйшыя яго вельмі шануюць. Дык вось, на плошчы пабудавалі клумбу ў форме возера з паўвостравам і ліхтаром на месцы капліцы. Атрымаўся своеасаблівы макет галоўнай вясковай славутасці. Пакуль яшчэ ідзе работа па добраўпарадкаванні, лаўкі не замацаваныя, але моладзь вечарам прыходзіць пасядзець. Так што плошча будзе запатрабаваная як месца адпачынку, ужо цяпер ясна.



Будынак былога КБА.

## Стаянка, знак, будынак

Алена Васілеўна паведаміла, што нядаўна зрабілі новы ўязны знак, на якім адлюстраваны год заснавання населенага пункта — 1566-ы — і намаляванае возера.

Добраўпарадкаванне пачалося з узвядзення стаянкі побач з будынкамі сацыяльнага прызначэння. Усё ў Лукаве размешчана кампактна: пошта, магазін, Дом культуры. Раней, асабліва пры правядзенні масавых мерапрыемстваў, заўсёды ўзнікала праблема з тым, дзе прыпаркаваць аўто. Цяпер пустыя ўчасткі вуліцы заасфальтавалі, нанеслі разметку, атрымалася стаянка, якая прымыкае да пешаходнай дарожкі.

Яшчэ ў Лукаве ганарацца, што нарэшце былы будынак КБА стаў прывабным. У службы быту не было сродкаў прывесці пабудову ў парадак, ды і вялікія яе плошчы аказаліся незапатрабаванымі. Па гэтай прычыне будынак перадалі ЖКГ. У вёсцы, дарэчы, ёсць участак раённага ЖКГ. Камунальнікі капітальна адрамантавалі былы КБА. Палову яго цяпер будуць выкарыстоўваць пад сваю кантору, а другую палову могуць здаваць у арэнду.

## Амбулаторыя, вуліцы, дарожкі

А яшчэ тут адрамантавалі амбулаторыю. Абнавілі ўсю медыцынскую ўстанову і набылі добрае абсталяванне для цэлага шэрагу кабінетаў. Урач цяпер прыязджае два разы на тыдзень, але такое становішча часовае, бо свой доктар знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску. Фельчар Галіна Сцепанюк праводзіць па калідорах амбулаторыі, паказвае новае аснашчэнне, адзначае, што медработнікі задаволеныя рамонтам.

Гэта яшчэ не ўсё, што зрабілі к дажынкам: добраўпарадкавалі школу, абнавілі яе фасад, прыбудавалі ганак. Школа ў Лукаве па вясковых мерках немалая — займаецца 106 вучняў. Падвозіць дзяцей стала больш зручна, бо заасфальтавалі вуліцу Школьную, а таксама кавалак дарогі, які злучае яе з Камсамольскай.



Помнік расстраляным землякам.

## Дзіцячы садок

Можна не сумнявацца: усе бацькі дашкольнікаў будуць згадваць сёлетнія дажынкі з удзячнасцю. Бо тэрыторыя садка даўно патрабавала добраўпарадкавання. **Загадчыца дашкольнай установы Любоў АЛЕСІК** паказвае адрамантаваную веранду, дзе можна будзе гуляць нават у дрэннае надвор'е. Яшчэ будаўнічая арганізацыя, якая праводзіла рамонт, — Маларыцкае ДРБУ, падарыла садку пясочніцу з дахам для самых маленькіх. «Цяпер нават няма з чым параўнаць, не засталося ніводнага лапіка разбітага двара, — расказвае Любоў Рыгораўна. — Зараз абсталявалі дарожку са святлафорамі, дзе можна праводзіць заняткі па бяспецы руху, раней яны выглядалі б тут недарэчна. У садку яшчэ размяшчаецца першы клас, з месцамі ў садку праблемы няма».

## Усёй грамадой

Падчас падрыхтоўкі да свята паляпшэннем займаліся не толькі падрадныя арганізацыі, якія ажыццяўлялі канкрэтныя праекты, знайшліся спонсары-прадпрымальнікі. Асноўнае ж фінансаванне ўзяло на сябе мясцовае сельгаспрадпрыемства — ААТ «Чырвоны партызан». Не засталіся ўбаку і жыхары вёскі: 40 гаспадароў домаўладанняў памянялі агароджу каля сваіх пабудоў, і не толькі на цэнтральных вуліцах. Вёска мае водаправод і газаправод. Цяпер на чарзе вялікі і значны праект — узвядзенне станцыі абезжалезвання. У дажыначную праграму гэты аб'ект не ўвайшоў.

**Старшыня раённага Савета Алег ЯКУБЧЫК** адзначыў, што практыка прывяздзення ў парадак аднаго населенага пункта напярэдадні дажынак сябе апраўдвае:

— Канцэнтруюцца сродкі, намаганні, падключаецца ініцыятыва органаў самакіравання. І як бачым на прыкладзе Лукава, знешні выгляд вёскі істотна змяняецца. На падрыхтоўку да сёлетняга свята пайшло каля 400 тысяч рублёў. Аддзелы адукацыі, аховы здароўя, культуры стварылі прывабны выгляд сваім установам, райспажыўсаюз прывёў у парадак краму, гаспадарка ўклала немалыя сродкі ў знешні выгляд населенага пункта. Дажынкі пройдуць, а ўсё пералічанае застанецца і будзе працаваць на якасць жыцця людзей. На наступны год месцам правядзення дажынак вызначана вёска Дарапеевічы, і работы пачнуцца ў канцы гэтага года. Дарэчы, у іншых вёсках людзі не раз задавалі пытанне: чаму не ў нас? Значыць, сельская жыхары ацанілі сацыяльны праект пад назвай «Дажынкі».

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Маларыцкі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 18 кастрычніка 2018 года.**